ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (1122) ● Чацвер, 18 сакавіка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

**35-МІЛЬЁННАЯ АРМІЯ КАМСАМОЛЬЦАЎ — НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК ПАРТЫІ, ЯЕ НЕПАСРЭДНЫ БАЯВЫ РЭЗЕРВ. ЯКІЯ Б ЗАДАЧЫ НІ СТАВІЛА ПАРТЫЯ, КАМСАМОЛ З ЭНТУЗІЯЗМАМ МАЛАДОСЦІ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ІХ ВЫРАШЭННЕ.**

*(З даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева на XXV з'ездзе КПСС).*

# ВОПЫТ І ПРАБЛЕМЫ СУМЕСНАЙ РАБОТЫ

**На сумесным паседжанні кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і бюро камітэта камсамола універсітэта з дакладам «Аб удасканальванні форм і метадаў сумеснай работы па арганізацыі і правядзенню грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў» выступіў сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна А. А. ТОЗІК. Ягс даклад у скарачэнні прадстаўляецца вашай увазе.**

НА сумеснае расшыранае паседжанне кафедры і бюро камітэта камсамола універсітэта вынесена пытанне аб удасканальванні форм і метадаў нашай работы па арганізацыі і правядзенню грамадска-палітычнай практыкі, якая па свайму зместу і функцыях у значнай ступені садзейнічае рашэнню галоўнай задачы ВНУ: падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаючых высокімі духоўнымі, маральнымі якасцямі, здольных выступаць у ролі ўмелага кіраўніка і выхавацеля калектыву. Грамадска-палітычная практыка ва ўсё большай меры становіцца неад'емнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ і таму можа разглядацца як адзін з галоўных напрамкаў камуністычнага выхавання студэнцтва.

Улічваючы гэтую асаблівасць, хацелася б спыніцца на тых пытаннях грамадска-палітычнай практыкі, стан якіх можна значна палепшыць у выніку ўдасканалення форм і метадаў нашай сумеснай работы.

### АРГАНІЗАЦЫЯ ЛЕКЦЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ

За апошнія гады мы дабіліся значных вынікаў, каардынуючы нашу работу. Пад кіраўніцтвам выкладчыка, які чытае лекцыйны курс ці вядзе семінарскія заняткі, практычна кожны студэнт на працягу паўтара года рыхтуе рэферат па выбранай тэме і па гэтай жа тэме выступае перад працоўнымі, вучнямі школ і ГПТВ, таварышамі па акадэмічнай групе. **Разам з тым набыты вопыт дазваляе выявіць і істотныя рэзервы па**



**вышэння эфектыўнасці нашай работы па арганізацыі лекцыйнай прапаганды. Па-першае, ні на адным факультэце няма добра распрацаванай камітэтам камсамола з дапамогай выкладчыкаў кафедры тэматыкі лекцый і гутарак, з якімі маглі б выступаць студэнты І і ІІ курсаў. Мы (я маю на ўвазе выкладчыкаў) у асноўным прытрымліваемся той тэматыкі, якая прыкладваецца да прыкладных планаў семінарскіх заняткаў. Тэмы часта вельмі складаныя, аб'ёмныя, глыбокія. Падрыхтоўка выступленняў па такіх тэмах не заўсёды па сіле студэнту І ці ІІ курса. І калі, выступаючы на семінарскіх занятках, ён атрымлівае дапамогу ад выкладчыкаў, то, выступаючы па-за універсітэтам, студэнт застаецца адзін на адзін з аўдыторыяй, а валодаць свабодна матэрыялам не можа.**

Паяўляецца няўпэўненасць у сваіх сілах, боязь аўдыторыі. Каб пазбегнуць гэтага, студэнты, выступаючы з гутаркамі, лекцыямі, часта адмаўляюцца ад тэм сваіх рэфератаў і выступаюць з тым матэрыялам, які ім бліжэй (у асноўным па прафарыентацыі). Відаць, гэта не трэба ігнараваць. Тэмы, якія даюцца ў прыкладных планах семінарскіх заняткаў, неабходна выкарыстоўваць для выступленняў на семінарах. Для выступленняў у іншай аўдыторыі неабходна распрацаваць тэматыку, якая б:

**1) давала студэнту магчымасць глыбока засвоіць яе, пазбавіўшыся такім чынам у значнай ступені ад боязі аўдыторыі;**

**2) выклікала б большую цікавасць у слухачоў;**

**3) стымулявала б студэнтаў.**

Гэта, на наш погляд, маглі б быць лекцыі па прафарыентацыі, асобных напрамках у рабоце камсамольскіх арганізацый і г. д. Распрацоўка такіх тэм дазволіла б учарашняму школьніку, рабочаму, калгасніку больш даведацца аб сваёй будучай прафесіі, універсітэце, яго калектыве, традыцыях і г. д. І самае галоўнае, нам трэба ўжо цяпер разам распрацаваць тэматыку лекцый, якая б увабрала ў сябе матэрыялы XXV з'езда КПСС.

**Па-другое, у падшэфных школах, ГПТВ вялікая патрэба ў лекторыях: па гісторыі камсамола, па прапагандзе матэрыялаў XXV з'езда КПСС, па маральна-эстэтычнаму выхаванню і** г. д. Нам вельмі цяжка бывае знайсці людзей для такога лекторыя. Аднаму студэнту гэта не па сіле. Затое такі лекторый магла б адносна лёгка весці група студэнтаў, абапіраючыся на дапамогу выкладчыка гісторыі КПСС. Эфектыўнасць нашай работы намнога павялічылася б.

Добра было б, каб студэнт загадзя ведаў, дзе ён будзе выступаць, перад кім, калі. Не сакрэт, што часта мы даем студэнту бязадрасную пуцёўку (дзе можа, там і чытае, а часам і наогул робіць толькі адзнаку). Такое становішча спраў не стымулюе студэнтаў, не прымушае іх глыбока вывучаць тэму. Загадзя ж запланаваць выступленні, распрацаваць тэматыку вялікіх цяжкасцей не прадстаўляе. Такую тэматыку, на наш погляд, павінны распрацаваць камітэты камсамола факультэтаў, улічваючы спецыфіку свайго факультэта, інтарэсы падшэфных калектываў і абапіраючыся на дапамогу выкладчыкаў гісторыі КПСС. Лекцыйная прапаганда набыла б планавасць, сістэматычнасць, абгрунтаванасць, мэтанакіраванасць.

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК НА САКАВІК — МАЙ 1976 ГОДА

1. XXV з'езд КПСС — падзея сусветна-гістарычнага значэння («Правда» за 8 і 9 сакавіка 1976 г.).
2. Дзесяты пяцігадовы план — праграма далейшага росквіту нашай вялікай сацыялістычнай Радзімы.
3. Няўхільны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа — вышэйшая мэта палітыкі Камуністычнай партыі.
4. Гіганцкі размах і глыбіня рэвалюцыйна-стваральных здзяйсненняў савецкага народа — канкрэтнае ўвасабленне ідэй вялікага Леніна (да 106-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна).
5. Свята міру, працы і брацтва (1 Мая—Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных. Часопіс «Палітінфарматар і арганізатар» № 7, 1976 г.).
6. КПСС — натхніцель і арганізатар перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (да свята Перамогі).
7. Дынамічнае і прапарцыянальнае развіццё грамадскай вытворчасці — важны напрамак эканамічнай стратэгіі партыі.
8. Паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу — вузлавая праблема развіцця эканомікі на сучасным этапе.
9. Усямернае павышэнне якасці работы — абавязак кожнага савецкага чалавека.
10. XXV з'езд КПСС аб павышэнні ролі навукі ў вырашэнні задач тэхнічнага прагрэсу, далейшай інтэнсіфікацыі вытворчасці.
11. Далейшае развіццё сельскай гаспадаркі — важнейшая агульнанародная задача.
12. Камуністычная ідэйнасць, адзінства перакананняў і практычнага дзеяння — вызначальная рыса характару будаўніка камунізму.
13. XXV з'езд КПСС аб патрыятычным выхаванні працоўных, умацаванні інтэрнацыянальнай свядомасці мас.
14. Падрыхтоўка чалавека да працы — важнейшая задача агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.
15. Надзейны памочнік і баявы рэзерв партыі (XXV з'езд КПСС аб задачах Ленінскага камсамола ў камуністычным выхаванні моладзі, мабілізацыі яе на паспяховае выкананне планаў дзесятай пяцігодкі).
16. Гістарычныя поспехі сацыялізму, рост яго магутнасці і ўплыву.
17. Непарушны баявы саюз камуністычных і рабочых партый краін сацыялізму—аснова іх цеснага супрацоўніцтва.
18. XXV з'езд КПСС аб задачах далейшай барацьбы за мір і міжнароднае супрацоўніцтва, за свабоду і незалежнасць народаў.
19. Пралетарскі інтэрнацыяналізм—магутная і выпрабаваная зброя камуністычнага і рабочага руху.
20. XXV з'езд КПСС аб антымарксісцкай, варожай ідэалам сацыялізму сутнасці мааізму, аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы супраць буржуазнай ідэалогіі і рэвізіянізму.
21. Рашэнні XXV з'езда КПСС — баявая праграма камуністычнага будаўніцтва, барацьбы за трывалы, справядлівы мір.



**З 27 сакавіка па 1 красавіка на ФПМ будуць праходзіць дні факультэта. Гэта свята стала традыцыяй і адзначаецца ўжо шосты год з дня заснавання факультэта. З натхненнем рыхтуюцца камсамольцы да гэтай знамянальнай падзеі.**

**Зараз у камітэце камсамола ідзе абмеркаванне дагавору аб супрацоўніцтве і сацыялістычным спаборніцтве, які заключаецца паміж факультэтам кібернетыкі Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта і ФПМ БДУ.**

**НА ЗДЫМКУ: члены камітэта камсамола ФПМ абмяркоўваюць план правядзення дзён факультэта.**

Фота **Т. Петрашкевіч.**

# ПА БДУ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта было абмеркавана пытанне «Аб кантролі з боку партыйнага бюро і дэканата фізічнага факультэта за ідэйным напрамкам лекцый і іншых відаў вучэбных заняткаў». На пасяджэнне былі запрошаны ўсе загадчыкі кафедр спецыяльных дысцыплін фізічнага факультэта. З дакладам выступіў дэкан фізфака дацэнт І. П. Зяцькоў. Па разгледжанаму пытанню была прынята адпаведная пастанова.

* * *

16 сакавіка ў БДУ адбыўся сход куратараў універсітэта. З дакладам аб задачах куратараў па растлумачэнню матэрыялаў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ выступіў дэлегат XXVIII з'езда КПБ рэктар БДУ У. М. Сікорскі.

Дакладчык падкрэсліў, што галоўная задача зараз — пераключэнне сеткі партыйных арганізацый на больш глыбокае вывучэнне матэрыялаў з'ездаў. Для студэнтаў усіх курсаў будзе праведзен спецкурс па матэрыялах з'ездаў у аб'ёме васьмі акадэмічных гадзін. У дакладзе былі даны папярэднія парады куратарам аб тым, як пачынаць работу ў акадэмгрупах, каб найбольш правільна данесці рашэнні з'ездаў да студэнтаў.

Бібліятэка — бліжэйшы памочнік куратара. Аб ролі бібліятэкі ў рабоце куратараў слухачам паведаміла дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская. Яна расказала аб кутку куратара, які створан на другім паверсе галоўнага корпуса, аб прыкладной тэматыцы дыспутаў, аб дапамозе ў арганізацыйнай рабоце куратараў у інтэрнатах, якую аказвае бібліятэка.

* * *

4 сакавіка на Кубу прыбыла дэлегацыя БДУ імя У. І. Леніна на чале з прарэктарам па навуковай рабоце прафесарам Л. В. Валадзько. Мэта паездкі— падпісанне рабочай праграмы супрацоўніцтва паміж БДУ і універсітэтам горада Камагуэй на 1976 — 1977 гг. У састаў дэлегацыі ўваходзяць дацэнт ФПМ М. А. Ляпяшынскі і дацэнт кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі Л. А. Гуцаленка. Яны будуць чытаць лекцыі выкладчыкам універсітэта на Кубе. Рабочая праграма ўключае ў сябе мерапрыемствы па абмену вопытам сярод выкладчыкаў, па аказанню дапамогі ў падрыхтоўцы спецыялістаў для кубінскага універсітэта.

# ПЯЦІГОДКА БЫЛА НАПРУЖАНАЙ



XXV з'езд КПСС і XXVIII з'езд КПБ паставілі велізарнай важнасці задачы ў галіне навуковых даследаванняў як перад працаўнікамі прыродазнаўчых, так і грамадскіх навук. У дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Леаніда Ільіча Брэжнева адзначаецца: «Партыя і дзяржава маюць патрэбу ў даследаваннях праблем, звязаных перш за ўсё з усебаковым развіццём вытворчасці і кіравання вытворчасцю, у рэкамендацыях, якія даюць магчымасць істотна павысіць яе эфектыўнасць».

Вельмі важным з'яўляецца паглыбленне даследавання пытанняў, якія адносяцца да тэндэнцыі развіцця нашага грамадства, яго вытворчых сіл. Сюды адносіцца, напрыклад, характар зместу працы ва ўмовах развітога сацыялізму, змяненне сацыяльнай структуры. Удасканальванне раздзялення па працы, стварэнне маральнага і матэрыяльнага стымулявання, добраўпарадкаваны быт і развіццё нашай многанацыянальнай і мнагаграннай культуры— усе гэтыя праблемы ў сваім вырашэнні патрабуюць аб'яднання намаганняў прадстаўнікоў розных навук. Неабходна і далейшае вывучэнне праблем развіцця нашай дзяржаўнасці, форм і метадаў выхаваўчай, ідэалагічнай работы. У гэтай сувязі вялікай увагі заслугоўвае вывучэнне грамадскай думкі.

Усё больш павялічваецца значэнне навуковага даследавання кардынальных праблем сусветнага развіцця і міжнародных адносін, суадносін барацьбы за дэмакратыю з барацьбой за сацыялізм, процiборства сіл у галоўным пытанні сучаснасці—у пытанні аб вайне і міры...

Такім чынам, для даследчыкаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды адкрываецца шырокае поле дзейнасці ў дзесятай пяцігодцы. Якія ж вынікі даследаванняў на факультэце ў мінулай пяцігодцы?

Калектыў выкладчыкаў факультэта журналістыкі ў мінулай пяцігодцы працаваў над такімі праблемамі, як: гісторыя журналістыкі і партыйна-савецкага друку БССР; гісторыя кнігавыдавецкай справы ў Беларусі; праблемы сучаснай публіцыстыкі, тэорыі і практыкі савецкага друку, мовы і стылю публіцыстычных жанраў, тэорыі і практыкі радыёвяшчання і тэлебачання. Усяго 26 тэм.

Цэнтрам навуковых інтарэсаў работнікаў факультэта была і застаецца ленінская тэматыка. На працягу пяцігодкі работнікамі факультэта і студэнтамі была праведзена вялікая работа ў галіне навуковых даследаванняў.

### ВЫНІКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ

За мінулую пяцігодку выкладчыкамі факультэта журналістыкі апублікавана звыш 400 друкаваных аркушаў навуковай прадукцыі, а таксама твораў мастацкай літаратуры аб'ёмам звыш 20 друкаваных аркушаў. Акрамя гэтага, выкладчыкамі апублікавана шмат артыкулаў, нарысаў у рэспубліканскіх і абласных газетах, перададзена па радыё.

За пяць гадоў апублікавана 19 манаграфій. Сюды ўваходзяць: «Газета і мараль», «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Аналітычныя жанры» — дацэнта Б. В. Стральцова, «У кадры і за кадрам», «Час, экран, крытыка» — дацэнта Е. Л. Бондаравай, «Журналіст у эканамічным пошуку», «Ад партрэта сучасніка да партрэта сучаснасці» — прафесара В. А. Пыжкова, «Тэхніка афармлення газетнай старонкі»—А. В. Балаша, «П. Н. Лепяшынскі» — прафесара Р. В. Булацкага, «Луначарскі — рэвалюцыянер-публіцыст» — прафесара Р. В. Булацкага і старшага выкладчыка А. А. Плаўнік, «Кузьма Чорны—публіцыст», «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай публіцыстыкі» — Р. В. Булацкага і І. І. Сачанкі, «Платон Галавач—публіцыст» — Р. В. Булацкага і Э. Карніловіч, «Вера Харужая — рэвалюцыянер-публіцыст» — Р. В. Булацкага і С. В. Талапінай, «Друк Заходняй Беларусі»—С. В. Говіна, «Хто такія «беларускія патрыёты»?»—І. І. Сачанкі, «Стылістыка публіцыстычных жанраў»—прафесара М. Я. Цікоцкага, «Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове» — доктара навук, дацэнта А. І. Наркевіча, «Беларуска-рускі слоўнік» — дацэнта С. М. Грабчыкава, «Шматаблічны экран»—М. Е. Дастанкі і А. А. Плаўнік, два зборнікі: «За газетным радком» і «Кіно Савецкай Беларусі», дзве кнігі мастацкіх твораў—Я. Р. Радкевіча і Б. В. Стральцова.

Вялікая колькасць манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, работа над якімі была завершана ў мінулай пяцігодцы, яшчэ не выйшла ў свет і знаходзіцца ў выдавецтвах.

Можна зрабіць вывад аб тым, што прафесарска - выкладчыцкі састаў факультэта журналістыкі ў цэлым працаваў у галіне выканання навуковых даследаванняў напружана. Рад выкладчыкаў не толькі выканалі запланаваныя тэмы, але і перавыканалі план.

### АБ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ СТУДЭНТАЎ ЗА ПЯЦІГОДДЗЕ

Прызначэнне і асноўны напрамак яе заключаецца ў тым, каб садзейнічаць выпрацоўцы у студэнтаў навыкаў даследчай работы, паглыблення ў матэрыял, умення лагічна мысліць, абагульняць, рабіць вывады, абгрунтоўваць сваю думку. У гэтай сувязі студэнты распрацоўвалі ў асноўным тэмы, блізкія да іх будучай прафесіі, г. зн. вопыт і праблемы гісторыі і тэорыі публіцыстыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, тэорыі і практыкі радыё-тэлевізійнай журналістыкі. Студэнцкія даследаванні, прадстаўляемыя на агляд, выконваліся на аснове курсавых работ.

Студэнцкая навуковая работа праходзіла ў асноўным у форме заняткаў гурткоў, кансультацый кіраўнікоў, удзелу ў канферэнцыях, аглядах-конкурсах. Нярэдка з дакладаў і рэфератаў, распрацаваных у гуртках, выраслі змястоўныя і цікавыя работы.

У 1971 годзе СНТ аб'ядноўвала студэнтаў-даследчыкаў у адным гуртку журналістыкі. Яго наведвала ад 60 да 70 студэнтаў. На універсітэцкай канферэнцыі з дакладамі выступілі 16 чалавек. Іх даклады пасля дапрацоўкі былі прадстаўлены на рэспубліканскі агляд.

У 1972 годзе працавала ўжо два гурткі—гісторыі журналістыкі і тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі. Іх наведвала ў сярэднім 90—100 чалавек. На канферэнцыях выступіла 28 студэнтаў, на конкурс былі прадстаўлены 24 работы.

З 1973 года на факультэце працуе 5 студэнцкіх навуковых гурткоў: гісторыі журналістыкі, савецкай публіцыстыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, стылістыкі, радыё і тэлебачання. У кожным з іх займаецца па 15—20, а часам і 25 студэнтаў. У агульнай колькасці гуртковай работай ахоплена да 120 студэнтаў. Павялічылася колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у канферэнцыях і аглядах. Цяпер гэтая лічба складае 35—40 чалавек, а ў 1975 годзе было прачытана 47 дакладаў. На агляд прадстаўлялася: у 1973 годзе—40 дакладаў, у 1974 годзе—33 і 8 па грамадскіх навуках (гэта было ўпершыню), у 1975 годзе—32 даклады на агульны конкурс.

Вынікі гарадскога агляду за мінулы год для нас увогуле добрыя—7 работ аднесены да першай катэгорыі, 11—да другой, астатнія—да трэцяй. Гэта шмат, хоць тут адбілася і недакладнае рэцэнзаванне спецыфічных па матэрыялу работ.

За апошнія гады значна пашырыліся нашы сувязі з іншымі ВНУ па лініі студэнцкай навуковай работы. Мы сістэматычна выязджаем у розныя гарады з дакладамі, да нас прыязджаюць студэнты з Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова, Адэсы, Казані, Варонежа, Новасібірска, Петразаводска.

Дзесятая пяцігодка ставіць перад калектывам супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта яшчэ больш складаныя задачы ў галіне навуковых даследаванняў. Патрабуюцца вялікія намаганні кожнага, каб праз пяць гадоў, падводзячы вынікі, мы з гонарам маглі сказаць: пяцігодка была напружанай.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**прафесар, дэкан факультэта журналістыкі.**

# ВОПЫТ І ПРАБЛЕМЫ СУМЕСНАЙ РАБОТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**Па-трэцяе, у цяперашні час роля выкладчыкаў заключаецца ў тым, каб дапамагчы студэнту падрыхтаваць тэкст лекцыі, гутаркі і ў якойсьці ступені пракантраляваць, дзе і калі ён выступае.**

Але застаецца яшчэ адно пытанне: большасць жа студэнтаў не ведае або часта толькі інтуітыўна мяркуе, як прачытаць гэтую лекцыю. Добра было б нам сумесна зрабіць што-небудзь для аказання метадычнай дапамогі першакурснікам. У шматлікіх ВНУ краіны, дарэчы, чытаецца курс «Асновы арганізацыйнай і грамадска-палітычнай работы ў працоўным калектыве» (напрыклад, у Калінінградскім універсітэце). Вучэбны план і праграма курса мяркуе пачатковую падрыхтоўку палітінфарматараў (І год навучання), прапагандыстаў (II год навучання), лектараў (III год навучання), кіраўнікоў грамадскіх арганізацый (IV год навучання) і арганізатараў працоўных калектываў (V год навучання).

У мінулым годзе такі спецкурс, разлічаны на 10 гадзін і распрацаваны старшым выкладчыкам А. С. Скокавым, чытаўся і ў нас на гістфаку (на III курсе). Студэнты слухалі яго з задавальненнем. Ёсць сэнс такі курс чытаць на ўсіх факультэтах, некалькі павялічыўшы яго (з тым, каб на першым курсе прысвяціць некалькі гадзін асновам лектарскага майстэрства, методыцы чытання лекцый і правядзення гутарак).

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА

У апошнія гады ўжываюцца такія паняцці, як «рэальны дыпломны праект», «рэальная курсавая работа», г. зн. такія студэнцкія навуковыя даследаванні, якія знаходзяць сабе прымяненне ў жыцці. Але, як правіла, калі ўжываюць гэтыя паняцці, то адносяць іх да факультэтаў прыродазнаўчага профілю. **На наш погляд, гуманітарныя факультэты маюць такія ж правы на рэальную студэнцкую работу. Апублікаваная ў друку работа студэнта-гісторыка, журналіста, філолага, юрыста, работа, якая выкарыстоўваецца партыйнымі, камсамольскімі работнікамі ў выхаваўчых мэтах, відаць, мае ўсе падставы лічыцца рэальнай. І мы павінны перайсці менавіта да такіх работ.**

У нас у горадзе нямала буйных шматтысячных партыйных, камсамольскіх арганізацый, маючых багатую, цікавую гісторыю, вывучэнне і прапаганда якой сыграла б вялікую ролю ў арганізацыі ідэйна-выхаваўчай работы. Відаць, ёсць сэнс пераключыць нашых студэнтаў на распрацоўку менавіта такіх тэм. Па-першае, такія работы патрэбны; па-другое, працуючы над гэтай тэмай, студэнт сутыкаецца з рэальным жыццём, з працоўным калектывам, ён будзе бачыць плён сваей працы; па-трэцяе, у выпадку поспеху работа можа быць апублікавана; па-чацвёртае, па тэмах гэтых работ студэнты могуць выступаць у гэтых жа калектывах, на камсамольскіх сходах, пленумах камсамольскіх арганізацый і г. д. Да распрацоўкі такіх тэм можна падключыць гісторыкаў, журналістаў, філолагаў.

Каб гэтыя мае думкі не здаліся утопіяй, спынюся на канкрэтных прыкладах. Нядаўна гарком камсамола даручыў нашай камсамольскай арганізацыі ўзяцца за стварэнне гісторыі Мінскай гарадской камсамольскай арганізацыі. Даручэнне складанае, сур'ёзнае, ганаровае. І думаю, што яно нашым студэнтам па сіле. Група студэнтаў-гісторыкаў ужо разгарнула работу над стварэннем гісторыі камсамольскай арганізацыі Мінскага трактарнага завода. Думаю, нам належыць пры кафедры стварыць гурток прыкладных гістарычных даследаванняў, куды б увайшлі групы, якія працавалі б над стварэннем гісторыі партыйных, камсамольскіх арганізацый, займаліся б даследаваннем асобных напрамкаў іх дзейнасці.

### РАБОТА Ў АТЭСТАЦЫЙНЫХ КАМІСІЯХ

Наша сумесная работа ў атэстацыйных камісіях па прыняццю Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай практыкі знаходзіцца ў добрым стане, але рэзервы для паляпшэння работы ў гэтым напрамку таксама ёсць. **Па-першае, мы яшчэ не дабіліся таго, каб атэстацыйныя камісіі дзейнічалі не толькі ў дні, калі прымаецца залік, а ажыццяўлялі кантроль за выкананнем студэнтамі сваіх абавязацельстваў на працягу года. Па-другое, мэтазгодна і неабходна на ўсіх факультэтах прыцягваць выкладчыкаў кафедры для работы ў аглядавых камісіях на I—II курсах. На юрфаку адміністрацыя і камсамол не лічаць гэта чамусьці патрэбным. І, па-трэцяе, у нас ва універсітэце Ленінскі залік і грамадска-палітычная практыка праходзяць як дзве аднатыпныя па зместу, але самастойныя па форме кампаніі.** Аглядавая камісія ў красавіку прымае Ленінскі залік, яна ж у верасні - кастрычніку прымае грамадска-палітычную атэстацыю. У многіх ВНУ краіны гэтыя мерапрыемствы сумешчаны і праходзяць у ленінскія дні ў красавіку. Што гэта дае? Сумяшчаючы гэтыя мерапрыемствы, мы пазбаўляемся ад значнай долі фармалізму, які яшчэ мае месца пры іх правядзенні; праводзячы адно мерапрыемства, мы атрымліваем магчымасць больш грунтоўна да яго падрыхтавацца (бо грамадска-палітычная практыка восенню, як правіла, праходзіць наспех і чакаемага выніку не дае); праводзячы атэстацыю ў красавіку, мы даём студэнту магчымасць да экзаменацыйнай сесіі ліквідаваць выяўленыя пры атэстацыі недахопы ў яго рабоце.

**Цікавы вопыт сумеснай работы камсамольскай арганізацыі накоплен на гістарычным, філалагічным факультэтах і факультэце журналістыкі. Бюро камітэта камсамола універсітэта хацела б выказаць прапанову: перанесці частку нашай работы ў студэнцкія інтэрнаты. Выкладчыкі могуць аказаць там дзейсную дапамогу ў арганізацыі быту і адпачынку студэнтаў.**

Такім чынам, дзелавое, грунтоўнае абмеркаванне канкрэтных пытанняў, абмен вопытам на сумесных пасяджэннях з'явяцца яшчэ адным крокам на шляху ўдасканалення работы па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

# ПАДЗЕЯ

**Студэнт-завочнік V курса факультэта журналістыкі Юрый Сысоеў быў у ліку тых, хто на старонках газет, па радыё і тэлебачанню асвятляў работу XXV з'езда КПСС. Сваімі ўражаннямі Ю. Сысоеў дзеліцца з чытачамі «Беларускага універсітэта».**

Масква. Крамлёўскі Палац з'ездаў. XXV з'езд КПСС. З гэтых слоў на працягу 10 дзён мы, беларускія журналісты, пачыналі перадаваць у рэдакцыі свае аператыўныя матэрыялы. Быць летапісцамі гэтай гістарычнай падзеі ў жыцці нашай краіны, у жыцці ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — вялікі гонар і вялікая адказнасць.

Гэтыя незабыўныя дні ўвабралі ў сябе столькі хвалюючых падзей, што спатрэбіцца нейкі час, каб цалкам ахапіць маштабы работы з'езда, прааналізаваць і ў поўнай меры ацаніць тое, што мы бачылі, чулі, адчулі ўсім сэрцам. Перачытваючы запісы ў блакнотах, праслухоўваючы кіламетры магнітнай стужкі, зноў акунаешся ў тую неперадаваемую атмасферу высокага душэўнага ўздыму, пачуцця адзінай згуртаванай сям'і ўсіх брацкіх народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы.

...Масква была падобна ў гэтыя дні на велізарную выстаўку. Яе вуліцы і плошчы ўпрыгожыліся шматстаронначнай, па кумачу напісанай справаздачай аб тым, што зрабіла краіна да XXV з'езда партыі. На ВДНГ СССР



*Дэлегаты Мінскай вобласці ў Музеі касманаўтыкі.* *Фота аўтара.*

# В. Р. ЗАЎРЫЕЎ

14 сакавіка 1976 года на 69-м годзе жыцця памёр загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін геаграфічнага факультэта доктар геаграфічных навук, прафесар Віктар Рыгоравіч **Заўрыеў.**

В. Р. Заўрыеў нарадзіўся ў г. Уфе ў сям'і інжынера. Ён прайшоў вялікі жыццёвы шлях. Працоўную дзейнасць пачаў у 1929 годзе: працаваў картографам, начальнікам пошукавай партыі. У 1940 годзе скончыў Тбіліскі дзяржаўны універсітэт. З 1942 года і да канца Вялікай Айчыннай вайны В. Р. Заўрыеў быў у дзеючай арміі, прайшоў баявы шлях ад берагоў Волгі да Берліна. Віктар Рыгоравіч узнагароджан трыма ордэнамі і многімі медалямі.

У пасляваенныя гады В. Р. Заўрыеў вёў навуковую і педагагічную работу ў Акадэміі навук Азербайджанскай ССР. Яму належаць фундаментальныя даследаванні па праблемах Каспійскага мора і геаграфіі Закаўказзя.

З 1960 года В. Р. Заўрыеў працаваў ва універсітэце. Ён унёс вялікі ўклад у падрыхтоўку спецыялістаў, навуковых работнікаў, у вывучэнне прыроды Беларусі. У гэтыя ж гады ён праводзіў палявыя даследаванні ў В'етнаме. Лекцыі В. Р. Заўрыева вызначаліся глыбокім зместам і даступнасцю. Віктар Рыгоравіч праводзіў таксама вялікую грамадскую работу, узначальваў савет ветэранаў вайны Белдзяржуніверсітэта.

Усе, хто ведаў Віктара Рыгоравіча Заўрыева, будуць памятаць яго як чалавека вялікай душы, ветлівага, добразычлівага. Памяць пра яго навечна застанецца ў сэрцах яго таварышаў па службе, баявых сяброў і выхаванцаў.

**Група таварышаў.**

*18 сакавіка — Дзень Парыжскай камуны*

# «ПАЎСТАНЕ ЎВЕСЬ ПАРЫЖ»

Парыж. 18 сакавіка 1871 года. Ранак.

—... Гукі набата прарэзвалі паветра: мы ішлі, ведаючы, што наверсе знойдзем армію, гатовую да бою... Нас быццам штосьці паднімала над зямлёй. Няхай мы памром, затое паўстане ўвесь Парыж. Бываюць такія моманты, калі натоўп становіцца авангардам чалавецтва...

**(З успамінаў камунараў)**

— ...На плошчу Абацтва накіроўваюцца натоўпы жанчын, грамадзянак Манмартра, яны хватаюць за вуздэчкі коней, акружаюць салдат, гавораць ім: «Як! Вы служыце ворагам народа, вы, яго дзеці!»

Як толькі генерал скамандаваў салдатам адкрыць агонь па натоўпу, з радоў выйшаў унтэр-афіцэр, стаў перад сваёю ротай і гучней генерала крыкнуў: «Прыклады уверх!» Салдаты павіналіся.

**(З успамінаў відавочцаў)**

9 гадзін раніцы. Дэзарганізацыя ўрадавых войск поўная. Брыгада, дзейнічаўшая на другім схіле Манмартра, не ўстаяла і ў беспарадку адступіла. Парыж паўстаў. Гвардзейцы і рабочыя дзейнічалі разам.

Пасля поўдня ўлада ў Парыжы перайшла ў рукі Цэнтральнага Камітэта нацыянальнай гвардыі.

— ...Мне называюць іх імёны, а я ніколі не чуў іх. Гэта дэлегаты батальёнаў, папулярныя толькі ў сваіх кварталах. Пакуль іх яшчэ толькі шэсць ці сем у гэтай велізарнай зале (Ратушы), дзе толькі нядаўна танцавала імперыя ў затканых золатам мундзірах і ў парадных туалетах. Цяпер з паўтузіны хлопцаў у грубых башмаках, шарсцяных кепі засядаюць у якасці ўрада пад гэтай столлю з вінеткамі з лілій.

**(З успамінаў відавочцаў)**

1975 год быў асаблівым для ўсяго савецкага народа. Гэта быў завяршальны год дзевятай пяцігодкі. Для студэнтаў нашага універсітэта вынікі праробленай за пяць год работы падводзіліся ў час здачы зімовай сесіі 1975—1976 навучальнага года. І тое, што гэта сесія была завяршэннем дзевятай пяцігодкі і адкрывала першы год дзесятай пяцігодкі, накладвала на камсамольцаў універсітэта пэўныя абавязкі. З гэтай задачай мы справіліся нядрэнна. На «выдатна» сесію здалі 1389 студэнтаў, на «добра» і «выдатна» — 4314. Паспяховасць па універсітэту склала 92,6 працэнта. Лепшымі па паспяховасці былі: юрыдычны факультэт — 98,7 працэнта, гістарычны факультэт — 97,5 працэнта, факультэт журналістыкі — 97 працэнтаў. На астатніх факультэтах паспяховасць утрымліваецца на пастаянным узроўні — 92,2 працэнта. Знізілася колькасць студэнтаў, якія здалі сесію толькі на «здавальняюча» — у зімовую сесію 1974—1975 навучальнага года такіх студэнтаў было 292, а ў гэту сесію — 268 чалавек. З другога боку, 675 студэнтаў універсітэта атрымалі нездавальняючыя ацэнкі, а ў мінулую зімовую сесію такіх студэнтаў было 567.

# МЭТА ВУЧОБЫ — ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ

Сесія паказала, што тыя студэнты, якія раўнамерна і сістэматычна працавалі з першакрыніцамі, акуратна і ў тэрмін выконвалі заданні, кантрольныя і курсавыя работы, экзамены здаюць паспяхова. Самая высокая паспяховасць у студэнтаў старэйшых курсаў, якія набылі і замацавалі навыкі пастаяннай работы па атрыманню новых ведаў. Паспяховасць студэнтаў пятага курса склала 97,8 працэнта, тады як паспяховасць студэнтаў першых курсаў — усяго 88,8 працэнта. З 675 чалавек, якія атрымалі нездавальняючыя ацэнкі, 224 — першакурснікі. Такім чынам, самае трывожнае становішча склалася на малодшых курсах. Лічыцца, што гэта вынік зацягнуўшайся акліматызацыі нядаўніх абітурыентаў ВНУ. А кожнаму ж з іх за лічаныя дні патрэбна даказаць, што семестр не прайшоў дарэмна і багаж ведаў павялічыўся. Але, на жаль, не кожны можа правільна і хутка сарыентавацца на экзамене і даць правільны адказ на пастаўленае пытанне.

Факультэцкія камсамольскія арганізацыі пастаянна ўдзялялі ўвагу падрыхтоўцы першакурснікаў. Праводзіліся сходы, на якіх разглядалі пытанні падрыхтоўкі да сесіі. Перад першакурснікамі выступалі лепшыя студэнты старэйшых курсаў, імянныя стыпендыяты, камсамольскія актывісты. На многіх факультэтах групы першакурснікаў курыруюць студэнты-старшакурснікі. Лепш за ўсё гэта работа пастаўлена на механіка-матэматычным факультэце.

Працэс акліматызацыі ўскладняецца тым, што не кожны першакурснік разумее адказнасць, якая ляжыць на ім. Ён можа расслабіцца, тым больш, што выкладчыкі не заўсёды кантралююць падрыхтоўку студэнтаў, як гэта было ў школе. Вельмі добра рашаюць пытанне дапамогі першакурснікам, кантролю за іх самастойнай работай на філалагічным факультэце. Тут грамадскі дэканат арганізаваў правядзенне студэнтамі старэйшых курсаў заняткаў, на якіх правяраецца работа першакурснікаў, даюцца кансультацыі па арганізацыі самастойнай работы, расказваецца, як працаваць з кнігай.

Заслугоўвае адабрэння работа вучэбна-выхаваўчых камісій гістарычнага і фізічнага факультэтаў. Гістарычны факультэт за апошнія гады моцна ўтрымлівае першыя месцы па паспяховасці. І гэтую сесію 159 чалавек здалі толькі на «выдатна», 501 — на «выдатна» і «добра», 7 студэнтаў здалі сесію толькі на «здавальняюча», 19 атрымалі нездавальняючыя ацэнкі. Сур'ёзна папрацавалі вучэбна-выхаваўчая камісія і камітэт камсамола гістфака.

Тое ж можна сказаць і аб ВВК на фізічным факультэце (старшыня камісіі — В. Шчарбакоў).

Вялікая ўвага ўдзяляецца вывучэнню грамадскіх навук. Абсалютная паспяховасць па грамадскіх навуках склала 98,1 працэнта. Па філасофіі і навуковаму атэізму студэнты універсітэта не атрымалі ні адной нездавальняючай ацэнкі за сесію. Па гісторыі КПСС абсалютная паспяховасць склала 97,4 працэнта, а па палітычнай эканоміі — 98,6 працэнта.

Пытанню павышэння паспяховасці па грамадскіх навуках сталі ўдзяляць значную ўвагу і прыродазнаўчыя факультэты. Так, нядаўна на факультэце прыкладной матэматыкі было праведзена сумеснае пасяджэнне камітэта камсамола і кафедры гісторыі КПСС. Разглядаліся пытанні вывучэння грамадскіх навук студэнтамі факультэта. Але ВВК ФПМ (старшыня камісіі — В. Ракецкі) прадстаіць яшчэ шмат папрацаваць, каб павысіць паспяховасць на факультэце да ўзроўню астатніх факультэтаў.

Зараз неаслабную ўвагу трэба ўдзяляць кантролю за наведваннем заняткаў. Агульны працэнт наведвання за мінулы семестр склаў 98,22 Больш за ўсё гадзін прапушчана студэнтамі філалагічнага факультэта— 4450, ФПМ — 2833, геаграфічнага — 2261.

Асноўнай задачай работы камсамольскіх арганізацый была і застаецца задача ўмацавання вучэбнай дысцыпліны і павышэння паспяховасці студэнтаў. Як адзначалася на пасяджэнні савета універсітэта, неабходна сістэматычна весці на факультэтах і кафедрах улік наведвання і бягучай паспяховасці студэнтаў, аналізаваць прычыны недастатковага засваення студэнтамі асобных раздзелаў па дысцыплінах і своечасова прымаць меры па іх ухіленню, выхоўваць у студэнтаў пачуццё адказнасці за вучобу і строгае выкананне вучэбнай дысцыпліны. У гэтым напрамку камітэтам камсамола факультэтаў і вучэбна-выхаваўчым камісіям прадстаіць яшчэ шмат зрабіць. Аналіз вынікаў гэтай сесіі прымушае задумацца і больш адказна падысці да правядзення мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне паспяховасці студэнтаў універсітэта.

**У. ПУЗІКАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце.**







**Шпарка бяжыць час, і асабліва — для студэнтаў. Здаецца, толькі ўчора была зімовая сесія, толькі ўчора былі хваляванні перад залікамі і экзаменамі, а ўжо не за гарамі і другая, летняя сесія, не менш складаная і важная. Аб гэтым добра памятаюць студэнты I курса юрыдычнага факультэта. Свае першыя ў жыцці студэнцкія экзамены яны здалі добра. І зараз старанна рыхтуюцца студэнты гэтага факультэта да прадстаячага новага выпрабавання. Трэба ж замацаваць ганаровае права называцца першымі!**

**...Я на занятках па крымінальнаму праву ў першакурснікаў. Тэма лекцыі — «Прычынная сувязь злачынстваў» — цікавая, але вельмі складаная. У аўдыторыі — рабочая цішыня. Гучыць толькі голас старшага выкладчыка В. Швяцова, шамацяць старонкі канспектаў. Сканцэнтраваныя твары, уважліва слухаюць першакурснікі тлумачэнні, усё новыя і новыя запісы паяўляюцца ў канспектах. Каб паспяхова вучыцца, трэба ўважліва слухаць, многа запамінаць, шмат чаго запісваць — гэтая простая ісціна добра вядома ўсім.**

**Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ВЕЛІЗАРНАГА ЗНАЧЭННЯ

ішоў шырокі паказ нашых дасягненняў у развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі. У Цэнтральнай выставачнай зале адкрылася новая экспазіцыя «Слава працы», дзе было сабрана ўсё лепшае, што створана да з'езда нашымі пісьменнікамі, мастакамі, архітэктарамі, кінематаграфістамі — прадстаўнікамі ўсіх творчых саюзаў. Тут можна было ўбачыць не толькі тое, што створана, але і як бы зазірнуць у яшчэ больш цудоўны заўтрашні наш дзень.

Урачыстая сустрэча дэлегацый на Беларускім вакзале, ускладанне вянкоў да Маўзалея У. І. Леніна, наведанне музеяў і памятных ленінскіх месц, пачатак рэгістрацыі дэлегатаў XXV з'езда КПСС у Георгіеўскай зале Вялікага Крамлёўскага Палаца — вось чым жылі дэлегаты рэспублікі перад з'ездам.

Вось і настаў дзень, якога чакалі, да якога рыхтаваліся ўсе савецкія людзі. У вялікім людскім патоку ідуць да Крамлёўскага Палаца з'ездаў члены беларускай дэлегацыі. Ідуць героі нашага часу. Рабочы, Герой Сацыялістычнай Працы Е. І. Клімчанка, трактарыстка, Герой Сацыялістычнай Працы Н. І. Куніцкая, народны паэт Беларусі Максім Танк, звеннявы механізаванага звяна, Герой Сацыялістычнай Працы А. М. Мокат.

Члены беларускай дэлегацыі абменьваюцца моцнымі поціскамі рук, гутараць з дэлегатамі з Сярэдняй Азіі, Далёкага Усходу, Украіны, Татарыі, Прыбалтыкі. Пытанні, адказы, абмен навінамі. Хутка запаўняюцца запісныя кніжкі. Вось ажыўлена гутараць брыгадзір маляроў з Гомеля Л. І. Яскевіч і знатны будаўнік Герой Сацыялістычнай Працы Н. А. Злобін. Ім ёсць аб чым пагаварыць. Беларускія будаўнікі паспяхова ўкараняюць у сябе «злобінскі» метад брыгаднага падраду. Ткачыха Мінскага тонкасуконнага камбіната Ф. І. Лліннік абмяркоўвае свае прафесіянальныя пытанні з ткачыхай Маскоўскага камбіната «Красная роза» В. І. Бабковай.

Пераходжу з мікрафонам ад адной групы дэлегатаў да другой, запісваю першыя інтэрв'ю.

Адкрыццё з'езда вылілася ў хвалюючую маніфестацыю трыумфу ідэй нашай партыі. Тэлевізійныя камеры і мікрафоны, якія былі ўстаноўлены ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў, быццам рассунулі яго сцены і ўвесь наш двухсотпяцідзесяцімільённы народ увайшоў у гэтую святочна прыбраную залу, разам з дэлегатамі ўсхвалявана слухаў даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева «Справаздача ЦК КПСС і чарговыя задачы партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі». У гэтым навуковым дакуменце падведзены вынікі пройдзенага шляху, дадзен глыбокі аналіз знешняй і ўнутранай палітыкі СССР, намечаны рубяжы новых грандыёзных здзяйсненняў. У палажэннях і вывадах даклада мы выразна адчувалі працоўны стваральны рытм Радзімы, непарыўную сувязь партыі і народа, бальшавіцкую патрабавальнасць у ацэнцы дасягнутага. Перад нашым мысленным поглядам як бы ўноў прайшлі ўсе рашаючыя этапы барацьбы за камунізм.

...Урачыстыя, дзелавыя пасяджэнні партыйнага з'езда. Мы слухалі выступленні дэлегатаў і гасцей, мелі магчымасць сустракацца і гутарыць з многімі з іх. І наша знаёмства, як правіла, пачыналася з размовы аб двух важнейшых партыйных дакументах — дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева і дакладзе Старшыні Савета Міністраў СССР таварыша А. М. Касыгіна «Асноўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады». Гэтыя дакументы раскрылі перад намі новыя перспектывы, узбагацілі новымі ведамі, усялілі новы зарад энергіі. Кожны дзень перад пачаткам ранішніх пасяджэнняў дэлегаты знаёміліся са спецыяльнымі выпускамі фотахронікі ТАСС і АДН, дзе ў яркіх каляровых здымках адлюстроўваліся важнейшыя моманты работы з'езда.

Тут жа можна ўбачыць і фатаграфіі, перададзеныя ў Маскву з розных куткоў нашай краіны. Членам нашай беларускай дэлегацыі было асабліва прыемна ўбачыць на здымках сваіх таварышаў па працы, якія выпусцілі ў час працоўнай вахты ў гонар з'езда новыя звышпланавыя аўтамабілі, трактары, станкі, выдатна падрыхтавалі сельскагаспадарчую тэхніку да сяўбы. Шматлікія тэлевізійныя і радыёканалы, тэлетайпы, міжгароднія і міжнародныя тэлефоны звязвалі Крамлёўскі Палац з'ездаў з усім светам. Дэлегаты пастаянна былі ў курсе спраў арганізацый, якія даверылі ім прадстаўляць камуністаў Беларусі на з'ездзе партыі.

(Працяг будзе).

# НАРОДНЫ АРКЕСТР: БУДНІ І СВЯТЫ



(Працяг. Пачатак у № 9).

### КРАКАЎ

Сустрэча з Польшчай пачалася для нас Варшавай. Гістарычны помнік горада — Стара Мяста. Помнікі Каперніку, Адаму Міцкевічу, старажытныя палацы і касцёлы, гарманічнае спалучэнне сярэдневяковай і сучаснай архітэктуры, выкарыстанне рэльефу мясцовасці пры стварэнні архітэктурных ансамбляў — усё гэта не можа не ўразіць таго, хто хоць раз наведаў польскую сталіцу.

У той жа дзень мы прыехалі ў Кракаў. Горад сустрэў нас вячэрнімі агнямі. Стары Горад—цэнтр сучаснага Кракава—захаваў сваю першапачатковасць. Кракаў авеян легендамі і павер'ямі. І менавіта ўвечары, калі змрок апусціцца на яго вузкія вулачкі, цьмянае святло на вежах касцёлаў робіць прастору загадкавай, і калі электрычныя ліхтары прыняць за газоўкі XI — XIII стагоддзяў, можна лічыць, што ты, як герой казкі Андэрсена, апынуўся ў сярэдневяковым гарадку. І толькі сучасная музыка ў кафэ і зусім не падобная на сярэдневяковую вопратка гавораць, што мы ў сённяшнім дні...

Народны аркестр народных інструментаў БДУ—першая група мінскіх студэнтаў, якая наведала Ягелонскі універсітэт у парадку культурнага абмену.

На ўсе дзесяць дзён польскія сябры прапанавалі нам багатую і цікавую праграму. У яе ўвайшлі сустрэчы са студэнтамі, кіраўнікамі маладзёжных і грамадскіх арганізацый, паездкі ў польскія Татры і горад Закапане, экскурсіі ў Асвенцым і Бжэзінку, наведанне саляных капальняў у Вялічцы і, канешне, знаёмства са славутасцямі Кракава. Экскурсіі ў Дом-музей У. І. Леніна, у Ягелонскі універсітэт, у былы каралеўскі палац Вавель, у Марыацкі касцёл запомняцца надоўга.

Універсітэт — адзін са старэйшых храмаў навукі ў свеце. І сёння ён буйнейшая ВНУ рэспублікі. Некалькі яго залаў сталі музейнымі. Як каштоўнейшыя рэліквіі захоўваюцца прылады, з якімі працаваў вялікі польскі вучоны Мікалай Капернік. У адным з куткоў музея знаходзіцца кніжка яго навуковых рукапісаў, астралябія, зоркавая карта неба, зробленая ім, глобус з яшчэ не адзначанай, не адкрытай Амерыкай.

Ды, пэўна, самы вялікі музей — усё ж такі ўвесь Кракаў. Дзесяткі касцёлаў, манастыры, палацы — гэта зараз помнікі архітэктуры, вышыні ўзлёту думкі, майстэрства і ўмення народа, багацце нацыянальнай культуры.

У Марыацкі касцёл і сёння прыходзяць людзі; многія—каб паслухаць арган, пазнаёміцца з інтэр'ерам. Прыгажун Марыацкі касцёл стаіць на цэнтральнай плошчы Кракава шмат стагоддзяў. І кожнае з іх пакідае свой адбітак на ім не толькі шчарбінай на камені...

### КАНЦЭРТЫ

Так ужо павялося, што канцэрты хвалююць заўсёды. На рэпетыцыях хвалюемся больш за сябе, на канцэртах—за слухача: ці зразумее, ці ўстановіцца наша жаданае трыадзінства?

Мы ўжо многа выступалі. Але за мяжой—упершыню. Хваляваліся. Міхаіл Аркадзьевіч з-за выпадковай, дробнай памылкі нерваваўся.

І вось зала сцішылася. На сцэне—вядучыя.

— Добры вечар,—спачатку па-руску, а потым па-польску. — Вас вітае народны аркестр народных інструментаў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Апладысменты. Зразумела, што гэта апладысменты ветлівасці, якой наогул вызначаюцца палякі.

— Яўген Глебаў. Жартоўная п'еса «Мушкецёры».

На сцэну імкліва, крыху нервова выходзіць дырыжор. Апладысменты. Паклон. Цішыня. Твар застыў на хвіліну. Узмах рукі—і пяцьдзесят сем інструментаў зліліся ў адзінае гукавое рэчышча. Дырыжорская палачка прымушае падпарадкавацца, не дае збіцца з рытму. Першы ўзмах як бы перадаў вялікае жаданне сыграць так, каб даказаць, што не дарэмныя былі праца, рэпетыцыі, давер'е, якое нам аказалі...

Недарэмныя... Апладысменты былі зусім іншыя. Такія, якіх чакалі часам доўга.

І зноў Наташа—вядучая ля мікрафона:

— Міхаіл Агінскі. «Паланез».

Перакладу не трэба... Увага слухачоў заваявана з першых акордаў.

Канцэрт прайшоў зусім непрыкметна. На такім уздыме мы даўно ўжо не ігралі.

Запомніўся і наш апошні канцэрт у г. Тарнове Гэта было напярэдадні свята Савецкай Арміі і Ваенна - Марскога Флоту. Як рэха далёкага, але незабыўнага ваеннага часу, калі складвалася савецка-польская дружба, гучаў матыў «Свяшчэннай вайны» ў песні Д. Смольскага «Абеліскі». Саліст аркестра Анатоль Дзічкоўскі звяртаецца да памяці нашых сучаснікаў... У зале на хвіліну становіцца ціха, і раптам — гром апладысментаў. У іх не толькі ўдзячнасць за выкананне. Гэта—рашучасць ветэранаў, што змагаліся поруч з савецкімі воінамі, гатоўнасць маладых абараніць заваяванае...

Ідуць нумар за нумарам. Нарэшце, апошні — хачатуранаўскі «Танец з шаблямі» з балета «Гаянэ». На гэты раз нас сустракаюць авацыі. Сэрцы нашы б'юцца хутчэй. Гэта ад радасці поспеху, радасці прызнання.

На сцэну ўзыходзяць дзве маленькія дзяўчынкі з вялікім кошыкам жывых кветак.

— Дзень-ку-ем! — у адзін голас аркестр.

— Дзя-куй! — а гэта нам ад слухачоў.

### ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ!

Аб сардэчнасці, шчырай увазе да нас з боку нашых польскіх сяброў можна расказваць доўга. Мы сустракаліся з гэтым па кожным кроку, у кожнай паездцы, экскурсіі, проста ў гутарцы. Ды адно тое, што ў нас паявілася шмат знаёмых у Ягелонскім універсітэце, гаворыць аб гэтым. І тое, што за ўсе дзесяць дзён з боку нашых новых сяброў у арганізацыі работы, адпачынку, знаёмстве з Польшчай не было ніводнага зрыву, гаворыць само за сябе. Цяпер, калі паездка ўжо закончылася, яна яшчэ гучыць успамінам цудоўнай музыкі ў душы, гучыць без ноткі фальшы.

Нашы гіды праводзілі нас да Варшавы, адкуль мы адпраўляліся ў Мінск. На вакзале каля вагонаў у многіх можна было ўбачыць блакноты, ручкі. Традыцыйны абмен адрасамі паміж сябрамі.

— Да новых сустрэч!

**Л. КАЛБАСКА,**
**удзельніца народнага аркестра народных інструментаў.**

---

## ТВОЙ ЭТЫКЕТ

# МАЙСТЭРСТВА ПЕРАКОНВАЦЬ

1. Пераконваць чалавека ў чым-небудзь — не значыць спрачацца з ім. Непаразуменні нельга ліквідаваць спрэчкай, іх можна ўхіліць толькі з дапамогай такту, імкнення да прымірэння і шчырага жадання зразумець субяседніка. Трэба ўлічваць псіхалогію спрачаючагася — чым больш чалавек спрачаецца, тым больш упартым становіцца.

2. Паважайце чужую думку. Калі вы хочаце сказаць, што чалавек памыляецца, не гаварыце яму аб гэтым рэзка і — што яшчэ горш — на людзях. У такіх умовах чалавеку псіхалагічна цяжка згадзіцца з вамі.

Ніколі не пачынайце з паведамлення: «Я гатоў вам даказаць». Гэта раўназначна таму, калі б вы сказалі: «Я разумней за вас. Я вам скажу пра адну рэч і прымушу змяніць вашу думку». Гэта свайго роду выклік. Такі зварот настройвае субяседніка супраць вас яшчэ да таго, як вы пачнеце яго пераконваць.

3. Калі чалавек выказвае якую-небудзь думку, а вы ўпэўнены ў яе памылковасці, лепш звярнуцца да субяседніка са словамі: «Я магу памыляцца. Давайце разбярэмся ў фактах». Вы ніколі не пападзеце ў цяжкае становішча, калі будзеце прызнавацца, што можаце памыляцца. Гэта прымусіць субяседніка быць настолькі справядлівым, як і вы, прымусіць яго прызнаць, што ён таксама можа памыляцца.

4. Лягчэй самому прызнаць свае памылкі або недахопы, чым выслухоўваць асуджэнне з боку іншага чалавека.

5. Не пачынайце важных размоў з патрабавання сказаць «так» або «не». Калі чалавек сказаў «не», яго прынцыпы патрабуюць заставацца і далей паслядоўнымі. Ен можа пазней адчуць, што «не» было няправільным, але вы самі адрэзалі яму шляхі да адступлення. Таму вельмі важна весці размову так, каб у субяседніка не было неабходнасці і магчымасці сказаць «не».

6. Калі хочаце пераканаць, старайцеся глядзець на рэчы вачыма гэтых людзей. Скажыце сабе: як бы я адчуваў сябе, калі б быў на яго месцы? Вы сэканоміце шмат часу і збераждзеце свае і чужыя нервы...

**(З кнігі В. Шэпеля «Кіраўнік і падначалены).**

---

У № 9 за 11 сакавіка 1976 года была дапушчана недакладнасць. У замалёўцы «Дэкан завочнага» трэба чытаць: «На яе рахунку толькі за 1975 год пяць навуковых работ, падручнік па старакаславянскай мове».




*У Віцебску адбыўся ўсесаюзны турнір па мастацкай гімнастыцы, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка. Гэтыя спаборніцтвы выклікалі вялікую цікавасць. Выступілі многія мацнейшыя гімнасткі.*

*Камандную перамогу атрымалі спартсменкі ДСТ «Спартак» (Мінск). На другім месцы прадстаўнікі «Працоўных рэзерваў» (Мінск) і на трэцім — студэнткі БДУ. У асабістым першынстве перамагла Вольга Рабіновіч («Спартак»), якая ўваходзіць у састаў юнацкай зборнай Савецкага Саюза.*

*Т. ПАДБЯРОЗКІНА,*
*майстар спорту па мастацкай гімнастыцы, студэнтка журфака.*

*НА ЗДЫМКУ: каманда гімнастак БДУ на турніры.*

---

## А КАЗКА ПОБАЧ З НАМІ...

Вы часам не заўважалі, што ў зімовым лесе хаваецца чараўніца-казка? Прыгледзьцеся ўважлівей. Вунь пянёк пад белым круглым капялюшам, насунутым на самыя вушы. Ці не схаваўся гэта адзін з сямі гномаў — маленькіх дзядкоў-чараўнікоў — з казак братоў Грым?

А вунь стройная, пушыстая, крыху сумная елачка ў белым іскрыстым кажушку — ці не прынцэса-прыгажуня гэта, зачараваная злым чарадзеем?

На палянцы каля елачак запятляў, закружыў і сам сябе заблытаў заячы след. Моцна напалохалі зайца, відаць, далёка не казачныя істоты.

Горка пустых, вылушчаных шышак чарнее на свежым снезе. Ну, гэта вядома, хто тут паснедаў і за сабой не прыбраў... Пушысты рыжы хвост сваволніцы, нібы язычок полымя, мігнуў сярод галінак і ў момант знік з вачэй.

А казка зноў зачароўвае мяне. І вось ужо здаецца, што з вясёлым гоманам выбеглі на палянку сяброўкі-хахатушкі, пабраўшыся за рукі. Раптам падзьмуў вецер, з дрэў пасыпаў снег і... не стала дзяўчат, толькі на заснежанай палянцы застыў нерухомы карагод маладых елачак.

Стромкія, бы нацягнутыя стрэлы, стаяць сосны. Здаецца — кране, і зазвініць страла, імкліва сарвецца і згіне ў сінечы неба.

Скаваная марозам крохкая цішыня, нават нейкая ўрачыстая сярод гэтага бялютка - іскрыстага ўбрання лесу. Цішыня да звону ў вушах. Зачараваная цішыня зачараванага лесу... І міжволі сцішаеш крокі, не жадаючы парушыць гэтую ўрачыстую казачнасць зімы. Раптам пад ногі трапляе сухая галінка, і, бы стрэл, гулка коціцца па лесе стогалосае рэха. Патрывожаная птушка зрываецца з дрэва; з галінкі сыпануўся ўніз белы зоркавы дождж ык. І зноў цішыня... А па-за ёй—хочаш-не хочаш — угадваецца вясна...

**Т. ВОЛКАВА.**



«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 00124 Заказ № 397.

В. а. рэдактара В. Д. РОШЧЫН.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.